*УДК 94:357(476+474.5)"1775"*

***Станіслаў Чаропка,***
*заг. кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт (Гомель, Беларусь)*

# ВАЕННАЯ РЭФОРМА 1775 г. У АРМІІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Гісторыя Беларусі XVIII ст. з'яўляецца вельмі няпростым этапам айчыннай мінуўшчыны. Гэты перыяд стаў лагічным працягам папярэдняга стагоддзя, калі беларускія землі былі арэнай кровапралітных войн. Можна заўважыць, што для Беларусі ў XVIII ст. кожны трэці год прыходзіцца на вайну. Рэч Паспалітая (РП) сапраўды ператварылася ў «прахадны двор» для армій суседніх дзяржаў і сярод іншых важнейшых прычын становішча, што склалася, стала слабасць узброеных сіл РП, застой у свядомасці грамадства ў пытаннях грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця, у т. л. і ў пытанні арганізацыі абароны дзяржавы. Тым не менш здаровыя сілы грамадства польска-літоўскай дзяржавы ўсё больш пераконваліся, што спадзяванні на архаічнае паспалітае рушэнне і наёмную пяхоту марныя, што трэба прыступаць да арганізацыі рэгулярнага войска, дзеля чаго патрэбна правядзенне кардынальных рэформ у справе арганізацыі арміі.

Нягледзячы на тое што вайсковая гісторыя Беларусі XVIII ст. ужо знайшла адлюстраванне ў гістарыяграфіі, тым не менш гісторыя стварэння рэгулярнай арміі ВКЛ гэтага перыяду яшчэ застаецца tabula rasa ў айчыннай навуковай літаратуры. Зроблены толькі першыя спробы разгляду гэтага пытання [1–4]. Больш сур'ёзны задзел у распрацоўцы гісторыі арміі ВКЛ адзначанага перыяду зрабілі польскія гісторыкі, якія пры даследаванні мінуўшчыны кароннага войска закраналі асобныя пытанні існавання літоўскай арміі [5–15]. Улічваючы навуковую значнасць праблемы і практычную адсутнасць спецыяльных даследаванняў па тэматыцы, вывучэнне гэтай тэмы з'яўляецца дастаткова актуальнай справай.

Першым важным крокам у справе арганізацыі рэгулярнай арміі ВКЛ стала ваенная рэформа 1717 г., якая прадугледжвала сур'ёзныя змены ў структуры ўзброеных сіл РП. «Нямы сойм» 1717 г. вызначыў сталы штат войска, бюджэт і крыніцы фінансавання арміі [16, s. 137]. Хаця сойм не прыняў канкрэтныя лічбы асабістага складу кароннай і літоўскай армій, але ён вызначыў колькасць «порцый» для пяхоты і «коней» для кавалерыі. Армія ВКЛ павінна была налічваць усяго 6 тыс. жаўнераў, у 3 разы менш, чым каронная армія [6, s. 256]. Такая мізэрная колькасць войска – 24 тыс. жаўнераў – падавалася камічнай, калі ўлічваць узровень мілітарызацыі суседніх дзяржаў. Напрыклад, сталае войска Францыі, Аўстрыі, Расіі ў мірны час налічвала па 100 тыс. чалавек, армія суседняй Прусіі складала каля 40 тыс. жаўнераў [9, s. 141]. Нават саюзнае РП саксонскае войска налічвала 30 тыс. салдат [17, s. 8, 10]. Нягледзячы на праграсіўныя захады, за перыяд з 1717 па 1764 г. армія, як і ўся дзяржава, прыйшла ў жудасны заняпад, яна патрабавала новага рэфармавання, што стала магчымым пасля выбрання манархам Станіслава Панятоўскага.

На канвакацыйным сойме 7 мая 1764 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Consilium bellicum, альбо Камісіі вайсковай, якая мусіла стаць каталізатарам рэформ у арміі [18, s. 39, 83]. Арганізацыя ў Кароне Consilium bellicum падштурхнула ўлады ў ВКЛ да падобных дзеянняў. На каранацыйным сойме 3 снежня 1764 г. было абвешчана аб стварэнні Вайсковай камісіі ВКЛ, месцам пастаяннага размяшчэння якой была вызначана Гародня [19, s. 170]. Мэтай працы камісіі стала ўсебаковае вывучэнне становішча армій РП і выкараненне асноўных праблем у ваеннай сістэме краіны [20, s. 20]. Камісія здолела зрабіць шмат для дасягнення сваёй мэты: «…усталявала парадак у арганізацыі, павысіла аслабленую субардынацыю і дысцыпліну, павысіла ўзровень адукацыі ў вышэйшых вайсковых, і ў рэшце рэшт стварыла армію, якая не саступала аніводнай тагачаснай еўрапейскай…» [20, s. 20]. На сойме 1766 г. былі зроблены захады, скіраваныя на павышэнне матэрыяльнага забеспячэння арміі ВКЛ. Так, на яе ўтрыманне было дадаткова выдаткавана 749 250 злотых штогод, да нормы, якая была прынята яшчэ на «нямым» сойме 1717 г. [21, s. 234–235].

Але паступовае рэфармаванне арміі было прыпынена палітычным крызісам, у якім апынулася ўся краіна з 1768–1772 гг. Адмова караля ад рэформ, Барская вайна і інтэрвенцыя Расіі, першы падзел РП нанеслі цяжкі ўдар па ўсёй дзяржаўнай сістэме і арганізацыі арміі ў тым ліку. Жаўнеры некалькі гадоў не атрымлівалі плату, афіцэры вымушаны былі прыкладаць значныя намаганні, пазычаць грошы, каб войска не разышлося. Са скарачэннем тэрыторыі РП пасля першага падзелу зменшылася і магчымасць утрымання арміі, бо паводле пастаноў «нямога» сойма 1717 г. аплата пэўных падраздзяленняў замацоўвалася за тым або іншым паветам.

Сумнае становішча арміі ВКЛ, яе відавочная няздольнасць абараніць краіну паставілі пытанне аб

неабходнасці чарговага кардынальнага рэфармавання войска. Гэтае пытанне было адным з найбольш важных на сойме 1773–1775 гг. Вынікам работы сойма стала рашэнне аб правядзенні ваеннай рэформы, якая прадугледжвала павышэнне колькасці арміі ВКЛ з 6 да 8 тыс. чалавек, а ўсёй арміі РП з 24 да 30 тыс. чалавек.

Была зменена сістэма вышэйшага кіравання войскам. Найвышэйшая ўлада перадавалася Вайсковаму дэпартаменту, дзе рашэнні прымаліся калегіяльна, а гетманы былі толькі сябрамі гэтага органа [10, s. 352]. Гетманы пазбавіліся права прызначэння афіцэраў, якое перайшло да караля [22, s. 534]. Прызначэнне падафіцэраў засталося ў кампетэнцыі палкоўнікаў.

Рэформа арміі ВКЛ прадугледжвала сур'ёзныя структурныя змены. Армія ВКЛ падзялялася на 2 дывізіі [10, s. 351]. Павялічвалася колькасць пяхотных падраздзяленняў за кошт скарачэння некаторых кавалерыйскіх часцей, а таксама адбывалася ўпарадкаванне арганізацыі конніцы. У прыватнасці, замест ранейшага падзелу кавалерыі на гусараў, пяцігорцаў і казацка-татарскіх лёгкіх харугваў уводзіўся падзел на больш цяжкую нацыянальную кавалерыю (НК) і больш лёгкую пярэднюю варту (ПВ).

Камплектаванне новых падраздзяленняў ажыццяўлялася пераважна за кошт тых, што існавалі раней. Так, 1-я брыгада НК камплектавалася ў асноўным за кошт гусарскіх харугваў, таму захавала нефармальную назву гусарскай. 2-я брыгада НК была заснавана на базе харугваў пяцігорцаў, таму яшчэ доўга называлася пяцігорскай. Палкі ПВ, у сваю чаргу, афармляліся на базе татарскіх і казацкіх харугваў і пазней атрымалі неафіцыйную назву уланскіх палкоў.

Вялікія змены адбываліся ў дачыненні драгунаў і пяхоты. Драгунскія палкі скарачаліся. Лейб-рэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ пераўтвараўся ў полк карабінераў гвардыі коннай. Астатнія тры драгунскія палкі спешваліся і пераўтвараліся ў пяхотныя палкі [23, s. 403]. Так, драгунскі рэгімент конны Булавы Вялікай стаў асновай 2-га рэгімента пешага; драгунскі рэгімент конны Булавы Польнай пераўтварыўся ў 4-ы рэгімент пешы; рэгімент драгунаў каралевіча быў пераўтвораны ў 5-ы рэгімент пешы ВКЛ. Такім чынам, колькасць пяхотных падраздзяленняў значна павялічвалася, што адпавядала неабходным для таго часу тэндэнцыям у ваеннай справе.

У выніку правядзення рэформы пяхота ВКЛ павінна была складацца з 7 палкоў і ўключаць ў сябе рэгімент пешы гвардыі літоўскай і 6 палкоў пешых, а таксама 2 янычарскія харугвы [23, s. 403].

Асобнае, але вельмі нязначнае месца ў літоўскай арміі займаў корпус артылерыі, які фактычна складаўся з 2 кампаній (рот). Яшчэ адным баявым падраздзяленнем была харугва венгерскай пяхоты Галоўнага Трыбунала ВКЛ, якая, аднак, у штат арміі афіцыйна не ўваходзіла.

Нягледзячы на звыклы для дзяржаўнага бюджэту Рэчы Паспалітай недахоп сродкаў, на фінансаванне арміі ВКЛ рашэннем сойма было выдаткавана 6596 тыс. злотых [23, s. 402–403]. Увага надавалася падрыхтоўцы дасведчаных афіцэрскіх кадраў. Са скарбу ВКЛ 100 тыс. злотых выдзялялася на дзейнасць рыцарскай школы ў Варшаве [24, s. 568]. Паводле пастановы сойма 1778 г. трэць кадэтаў школы павінна была паходзіць з ВКЛ [25, s. 585–586].

Але, як паказаў час, увасобіць рашэнні сойма ў жыццё і на гэты раз аказалася справай надзвычай цяжкай. У 1776 г., у сувязі з недахопам фінансавання, вайсковы бюджэт быў скарочаны больш чым напалову да 2,3 млн злотых [24, s. 565, 568]. У выніку гэтага запланаваная колькасць арміі ВКЛ у 8 тыс. чалавек дасягнута не была і ў другой палове 1770-х гг.: армія ВКЛ налічвала ўсяго 4770 вояроў.

9 снежня 1776 г. быў складзены кампут войска ВКЛ, які дае выдатную інфармацыю аб структуры арміі і яе фінансаванні, а таксама аб іерархіі ваенных чыноў адпаведна іх пазіцыі ў спісе і заробку, які яны атрымлівалі [26]. Так, на ўтрыманне аднаго Генеральнага штаба арміі ВКЛ, які складаўся з 25 чалавек, выдзялялася 260 тыс. злотых [26, s. 5] (для параўнання: на полк гвардыі коннай колькасцю 374 чалавекі або полк гвардыі пешай колькасцю 609 чалавек на ўтрыманне выдзялялася ўсяго на 10 тыс. злотых больш [26, s. 6]).

Вышэйшымі асобамі Генеральнага штаба з'яўляліся вялікі гетман, заробак якога складаў 60 тыс. злотых, што, дарэчы, удвая менш, чым вызначана канстытуцыяй вальнага сойма 1775 г., і польны гетман, які атрымліваў 40 тыс. злотых. Сярэдняе звяно Генштаба складалі генерал артылерыі, польны пісар, вялікі стражнік, генерал-інспектар, генерал-лейтэнант і два генерал-маёры. Ніжэйшым камандным звяном Генштаба з'яўляліся пісар вайсковы, стражнік польны, абозны польны, касір вайсковы, эксэрцэр-маёр кавалерыі, па 2 генерал-ад'ютанты вялікага і польнага гетманаў адпаведна, 2 бунчужных, генерал-аўдытар, рэгіментар вайсковы, суддзя вайсковы, станаўнічы і генерал-ад'ютант пры Вайсковым дэпартаменце ВКЛ [26, s. 5].

Кавалерыя Вялікага Княства налічвала 2670 коней і складалася з палка гвардыі коннай, 2 брыгад НК і 5 палкоў ПВ. Полк коннай гвардыі ВКЛ, у адрозненне ад адпаведнага кароннага палка, налічваў не 425, а ўсяго 318 чалавек, на фінансаванне якіх выдзялялася 269 364 злотыя, што эканоміла для дзяржаўнага бюджэту крыху больш за 90 тыс. злотых [26, s. 21].

Абедзве брыгады НК налічвалі па 478 коней з фінансаваннем па 300 тыс. злотых на брыгаду. Кожная брыгада складалася з 4 швадронаў (эскадронаў), кожны з якіх уключаў у сябе па 4 харугвы. Брыгаду ўзначальваў камендант, яго намеснікам выступаў віцэ-камендант. Пры штабе брыгады знаходзіліся таксама 16 ротмістраў, ад'ютант, кватармайстар, аўдытар, трубач, а таксама вазніца з падводай для перавозкі штабных дакументаў [26, s. 13]. Пры штабе была і медыцынская частка, якая складалася з фельчара

і 4 падфельчараў, а таксама ветэрынарная служба ў складзе канавала (ветэрынара) і 2 кавалёў. Тактычнай адзінкай брыгады з'яўлялася харугва. У кожным з 4 эскадронаў налічвалася па 4 паручнікі, кожны з якіх кіраваў асобнай харугвай, па 4 харунжых, 48 таварышоў, сярод якіх 4 мелі статус наменікаў, па 4 унтэр-афіцэры, 48 шараговых і 2 трубачы [26, s. 16].

Найбольш цяжка рэформа праходзіла менавіта ў брыгадах НК. Ротмістры, паручнікі і харунжыя звычайна паходзілі з магнатаў, былі ваяводамі, кашталянамі і г. д. Паводле ўспамінаў Е. Кітовіча, ротмістрамі НК былі нават кароль і віленскі біскуп [27, s. 157]. Як адзначае сучаснік С. Касмоўскі, яны не мелі «ніякага ўяўлення аб вайсковай службе… Гэтыя ўсе толькі для гонару нашэння мундзіра тыя рангі мелі, бо ранг ротмістра азначаў генерала, ранг паручніка – палкоўніка, а харунжага ранг – падпалкоўніка, намеснік жа меў ранг капітана, таварыш – ранг харунжага» [28, s. 6].

Рэальным кіраўніком харугвы быў намеснік, а харунжы, паручнік і ротмістр, што стаялі над ім, выконвалі хутчэй рытуальныя функцыі. Таварышамі, якія звычайна складалі каля паловы асабістага складу кожнай харугвы, былі пераважна прадстаўнікі далёка не беднай шляхты. Таму хоць таварышы і шараговыя фактычна і выконвалі адны і тыя ж функцыі, тым не менш таварышы адносіліся да афіцэрскага складу падраздзялення і непасрэдна падпарадкоўваліся не унтэр-афіцэрам, а намеснікам. У той жа час шараговыя падпарадкоўваліся як сваім таварышам, так і унтэр-афіцэрам. Такая сістэма прыводзіла да зніжэння баяздольнасці гэтых падраздзяленняў.

Важным элементам рэформы стала ўвядзенне сістэмы адпаведнасці вайсковых званняў кавалерыі і пяхоты, у прыватнасці: «таварыш роўны будзе мець ранг з харунжым у войску, намеснік з паручнікам, харунжы з капітанам, паручнік з палкоўнікам. Камендант брыгады нацыянальнай мець будзе ранг генерал-маёра, віцэ-камендант той жа брыгады нацыянальнай – ранг палкоўніка» [29, s. 100]. Былі дакладна вызначаны паўнамоцтвы генерала артылерыі, генерал-лейтэнантаў і генерал-маёраў, а таксама пытанні адказнасці вайскоўцаў за зробленыя імі злачынствы ў адносінах да мірнага насельніцтва [29, s. 100–104].

У адрозненне ад брыгад НК у палках ПВ колькасць асабістага складу падраздзяленняў была рознай. Напрыклад, у 1-м палку каралевіча налічвалася 374 чалавекі, 2-і полк Булавы Вялікай і 3-і полк Булавы Польнай налічвалі па 150 вояроў адпаведна, у 4-м палку Панятоўскага службу выконвалі 327 жаўнераў, а самым шматлікім быў 5-ы полк генерала Беляка, які меў 395 шабель у сваім складзе [26, s. 6]. Звычайна полк складаўся з 6 харугваў і штаба. У штаб палка ўваходзілі палкоўнік, маёр і 6 ротмістраў, якія, як і ў брыгадах НК, толькі фармальна камандавалі харугвамі, пераклаўшы гэты цяжар на паручнікаў. Пры штабе знаходзіліся кватармайстар, фельчар, прафас, каваль, таксама маглі быць харунжыя на пасадзе ад'ютанта і інш. На чале кожнай з харугваў стаялі паручнікі (у палку Беляка былі таксама секунд-паручнікі), харунжыя, таварышы, капралы, трубачы і початавыя [26, s. 37, 41].

Нягледзячы на тое што ў падраздзяленнях колькасць афіцэраў часта дасягала трэці асабістага складу, тым не менш ва ўмовах існавання сістэмы куплі-продажу афіцэрскіх званняў, кваліфікаваных афіцэраў відавочна не хапала. Званне ротмістра каштавала 2 тыс. злотых, паручніка – 1 тыс., харунжага – 500, намесніка – 250, таварыша – 100 злотых [28, s. 7]. Калі ўлічыць, што заробак паручніка ў брыгадах НК складаў 3400 злотых, у палках ПВ – 1500, а ў пяхоце – 1200 злотых у год, то камерцыйная карысць ад набыцця звання відавочная. Сучаснік Ю. Рулікоўскі адзначае, што «можна было быць афіцэрам і не бачыць свайго рэгімента або харугвы, а сядзець спакойна ў доме і гаспадарыць» [30, s. 192]. Але і тут удалося дамагчыся пэўных поспехаў. У брыгадах НК з'явілася пасада камандзіра эскадрона ў званні маёра, мэтай якога было ўсталяванне дысцыпліны. Ваяводы і кашталяны, якія апынуліся пад уладай каралеўскіх стаўленікаў-маёраў, не жадалі падпарадкоўвацца вайсковай дысцыпліне і сталі прадаваць свае званні, а па сведчаннях Касмоўскага, часам і аддаваць бясплатна свае званні [28, s. 201]. Такім чынам, на пасадах ротмістраў і паручнікаў сталі з'яўляцца больш здольныя да вайсковай службы людзі. Пазней, на сойме 1784 г., былі зроблены захады па абмежаванні продажу афіцэрамі сваіх званняў [31, s. 12].

Колькасць асабістага складу пяхотных падраздзяленняў аказалася яшчэ меншай за кавалерыйскія, пяхота налічвала 2075 чалавек і, як было прадугледжана пастановай сойма 1775 г., складалася з гвардзейскага і 6 палявых палкоў, а таксама з 2 янычарскіх харугваў [26, s. 6]. Такая структура пяхоты і колькасць яе асабістага складу ў нязменным выглядзе праіснавала да ваеннай рэформы 1789 г., якую распачаў Вялікі сойм.

Найбольш буйным пяхотным падраздзяленнем быў рэгімент гвардыі пешай ВКЛ, які колькасна амаль у 2,7 раза перавышаў палявыя пяхотныя палкі і налічваў 609 штыкоў. На фінансаванне гэтага падраздзялення выдзялялася 273 969 злотых, што перавышала забеспячэнне палявога палка ў 3,2 раза [26, s. 6].

Палявыя палкі 1-ы і 3-і Булавы Вялікай, а таксама 2-і і 4-ы Булавы Польнай налічвалі па 220 чалавек і мелі аднолькавую структуру. Штаб палка складаўся з палкоўніка, падпалкоўніка і маёра. Пры штабе палка знаходзіліся таксама ад'ютант, палкавы кватармайстар, аўдытар, палкавы добаш і вазніца са штабной падводай. Пры кожным палку існавала медыцынская частка ў складзе палкавога фельчара і двух падфельчараў. У адрозненне ад гвардзейскага рэгімента, палявыя палкі складаліся толькі з аднаго батальёна, які, у сваю чаргу, уключаў чатыры кампаніі (роты) па 52 чалавекі ў кожнай. Камандзірамі

рот з'яўляліся капітаны, хаця першая і другая роты фармальна называліся кампаніямі палкоўніка і падпалкоўніка. Інакш выглядала справа ў трэцяй роце, дзе пасады капітана не было, а яе непасрэдным камандзірам з'яўляўся маёр, які лічыўся пры штабе. У кожнай роце быў паручнік, харунжы, фельдфебель, падхарунжы, фур'ер, два капралы, файфер (трубач), 2 добашы, 1 вазніца з ротнай падводай і 40 гемайнаў (шараговых) [26, s. 53].

5-ы і 6-ы палкі былі меншымі за папярэднія палявыя палкі і налічвалі 171 і 110 жаўнераў адпаведна. 5-ы рэгімент пешы Грабоўскага апрача палкоўніка меў яшчэ шэфа палка, а ў ротах налічвалася па 30 (у першай) – 40 (у другой, трэцяй і чацвёртай кампаніях) чалавек [26, s. 69]. Яшчэ менш жаўнераў налічваў 6-ы рэгімент пешы князя Масальскага, які складаўся з двух рот па 50 чалавек [26, s. 73].

Функцыі гвардыі пры кожным з гетманаў выконвалі харугвы янычараў. Структура абедзвюх харугваў была аднолькавая. Яны адрозніваліся толькі колькасна – у харугве Булавы Вялікай было 100 жаўнераў, Булавы Польнай – 80 [26, s. 77, 79]. На чале харугвы знаходзіўся ротмістр, заробак якога адпавядаў заробку ротмістра палка ПВ (3 тыс. злотых) і амаль у 2 разы перавышаў заробак капітана палявога пяхотнага палка (1,8 тыс. злотых) [26, s. 37, 53, 77]. Афіцэрскі і падафіцэрскі склад харугваў уключаў у сябе паручніка, секунд-паручніка, харунжага, сержанта, падхарунжага і 6 капралаў. Пры штабе харугвы знаходзіліся таксама фельчар, кватармайстар, капельмайстар, падкапельмайстар і 13 музыкаў. Колькасць шараговых жаўнераў – гемайнаў – складала ўсяго 70 і 50 чалавек адпаведна [26, s. 77, 81].

Як і раней, у гаротным стане знаходзілася артылерыя ВКЛ, якая ўключала ў сябе корпус артылерыі і грэнадзёрскую фрайкампанію (асобную роту). Корпус артылерыі налічваў усяго 49 чалавек і складаўся з штаба корпуса і адной роты. Камандны склад корпуса прадстаўлялі палкоўнік, обер-штэрлейтэнант (падпалкоўнік), маёр, капітан, цуг-капітан, паручнік, штык-юнкер, і обер-фельчар. Артылерыйская кампанія налічвала 30 кананіраў і 11 падафіцэраў, сярод якіх фейрверкер, сержант, кватармайстар, цуг-дынер, два капралы, фельчар, па два трубачы і добашы [26, s. 45].

Асобная грэнадзёрская рота шматлікасцю таксама не адзначалася, усяго разам яна налічвала 76 чалавек. Камандны састаў складаўся з капітана, паручніка, другога паручніка і ад'ютанта. Да падафіцэраў адносіліся фельдфебель, сержант, два падхарунжых, кватармайстар, два капралы, фельчар, па два трубачы і добашы. Шараговых грэнадзёраў налічвалася ўсяго 60 [26, s. 46].

На жаль, рэформы аказаліся палавінчатымі. Зрабіўшы крокі ў бок павелічэння колькасці войска і яго структурнай мадыфікацыі, прынцып камплектавання арміі заставаўся ранейшым – у кавалерыі шляхам прыводу таварышамі сваіх початаў, а ў пяхоце праз вярбоўку добраахвотнікаў. Ва ўмовах, калі вядучыя краіны Еўропы, такія як Францыя, Прусія, Расія, ужо перайшлі да рэкруцкага спосабу камплектавання арміі, гэта быў відавочны недахоп, які значна зніжаў абараназдольнасць краіны.

Грошай на забеспячэнне арміі катастрафічна не хапала, і таму праблема ўтрымання жаўнераў часта ляжала на плячах камандзіраў падраздзяленняў. Так, брыгадзір велікапольскай брыгады НК у 1776 г. з сумам узгадваў: «Гэта вялікая бяда, што гола… дукатаў, якіх не слыхаць і не відаць. Каманду патрэбна апрануць, каб не было сорамна, каб плячамі не свяцілі» [32, s. 199]. Тым не менш на сойме 1778 г. была пацверджана лінія на павелічэнне «войска ў гемайнах і таварыства кавалерыі нацыянальнай», а праз два гады на сойме зноў разглядалася пытанне аб даўкамплектаванні арміі ВКЛ [25, s. 579; 33, s. 585].

Такім чынам, рэформа арміі ў 1775 г. з'яўлялася вельмі неабходнай для ВКЛ і ўсёй РП з'явай. У выніку асцярожных дзеянняў Вайсковай камісіі пачаліся станоўчыя зрухі ў пытанні арганізацыі ўзброеных сіл краіны. Армія ВКЛ стала паступова ператварацца з дэкаратыўнага элемента ў сапраўдны баявы інструмент дзяржавы. Рэформа 1775 г. стала важным падмуркам для далейшага развіцця ўзброеных сіл як у ВКЛ, так і Польшчы, якое адбывалася ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XVIII ст.

## ЛІТАРАТУРА

1. Грыгор'еў, М. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765–1794) / М. Грыгор'еў. – Мінск, 1994. – 168 с.

2. Гужалоўскі, А. Войска ВКЛ: апошнія старонкі гісторыі / А. Гужалоўскі // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 48–52.

3. Чаропка, С. А. Войска ВКЛ у святле ваеннай рэформы 1717 г. / С. А. Чаропка // Науч. труды Респ. ин-та высш. школы: сб. науч. статей: в 2 ч. / редкол. В. Ф. Берков (отв. ред.) [и др.]. – Минск: РИВШ, 2012. – Ч. 1. – С. 336–343.

4. Чаропка, С. А. Ваенная рэформа ў Вялікім княстве Літоўскім 1764–1766 гг. / С. А. Чаропка // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зб. навук. арт. / рэдкал.: Р. Р. Лазько [і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – Вып. 1. – С. 25–30.

5. Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziłów równorzędnych od r. 1717 do r. 1831 / B. Gembarzewski. – Warszawa: Nakładem tow. wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s.

6. Górski, K. Historya piechoty polskiej / K. Górski. – Kraków: Nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1893. – 274 s.

7. Górski, K. Historya jazdy polskiej / K. Górski. – Kraków: Nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1894. – 366 s.

8. Górski, K. Historya artyleryi polskiej / K. Górski. – Warszawa: Księgarnie E.Wende, 1902. – 325 s.

9. Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce / M. Kukiel. – Kraków: Nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.

10. Nowak, T. M. Historia oręża Polskiego 963–1795 / T. M. Nowak, J. Wimmer. – Warszawa: Wiedza powszechna, 1981. – 700 s.

11. Nowak, T. Dzieje oręża Polskiego do roku 1793: w 3 t. / T. Nowak, J. Wimmer. – Warszawa: MON, 1968. – T. 1. – 418 s.

12. Rostafiński, N. Zarys historii rozwoju wojskowości w Polsce (992–1792) / N. Rostafiński. – Poznań: Nakładem księgarni Fr. Gutowskiego, 1922. – 164 s.

13. Wimmer, J. Historia piechoty polskiej do roku 1864 / J. Wimmer. – Warszawa: MON, 1978. – 615 s.

14. Augustyniak, U. Historia Polski. 1572–1795 / U. Augustyniak. – Warszawa: wyd-wo naukowe PWN, 2008. – 1008 s.

15. Historia wojskowości polskiej. – Warszawa: MON, 1972. – 871 s.

16. Konstytucye Seymu pacificationis Warszawskigo 1717 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VI. – S. 122–202.

17. Müller, R. Die Armee Augusts des Starken. Das sächsische Heer von 1730 bis 1733 / R. Müller. – Berlin: Militärverlag der DDR, 1984. – 116 s.

18. Konfederacya Generalna omnium Ordinum Regni et Magni Ducatum Luthuaniae na konwokacyi Głowney Warszawskiey uchwalona // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 7–55.

19. Konstytucye Seymu walnego koronacyi krola IMCI 1764 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 138–169.

20. Twardowski, B. Wojsko polskie Kościuszki w roku 1794 / B. Twardowski. – Poznań: Nakładem Księgarni katolickiej, 1894. – 90 s.

21. Konstytucye Wielkiego Ksęstwa Litowskiego 1766 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 222–244.

22. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego roku 1776 od dnia 26 sierpnia aż do dnia 31 października, hod względem Konfederaczi Generalnej oboyga narodów agitującego się // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 526–564.

23. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1775 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 389–590.

24. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1776 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 564–574.

25. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego 1778 dnia 5 miesiąca października // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 575–590.

26. Biblioteka Czartoryskich. – Rękopis 2555 IV. – Komput y płaca woyska WXL. – 84 s.

27. Kitowicz, J. Opis obyczajów i zwyczajów za panowania Augusta III. – Kraków, 1925. – XXXIII, 408 s.

28. Pamiętniki Stanisława Kosmowskiegoz końca XVIII wieku. – Poznań, 1867. – 100 s.

29. Konstytucye Seymu extraordynaryinego Warszawskiego 1775 r. // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 5–389.

30. Urywek wspomnień Józefa Rulikowskiego wydany z obszerniejszego rękopismu // Baranowski, B. Dzieje wojskowości Polskiejdo roku 1831 (wypisy źrodłowe) / B. Baranowski, W. Bortnowski, W. Lewandowski. – Warszawa: Prasa wojskowa, 1949. – S.191–196.

31. Konstytucye Seymu walnego ordynarnego Grodzieńskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego MDCCLXXXIV dnia 4 miesiąca października // Volumina Legum. – Kraków: Nakładem Akademii Umejętności , 1889. – T. IX. – S. 7–29.

32. Notaty generała brygady wielkopolskiej kawalerii narodowej z lat 1775–1778 // Baranowski, B. Dzieje wojskowości Polskiejdo roku 1831 (wypisy źrodłowe) / B. Baranowski, W. Bortnowski, W. Lewandowski. – Warszawa: Prasa wojskowa, 1949. – S. 196–199.

33. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego 1780 dnia 2 miesiąca października // Volumina Legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 582–590.

***Станислав Черепко***

## ВОЕННАЯ РЕФОРМА 1775 г. В АРМИИ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО

*Резюме*

В представленной статье рассматривается состояние регулярной армии Великого Княжества Литовского в середине XVIII в. Автором дается краткий обзор зарубежной и отечественной историографии по теме исследования. Показываются внешнеполитические и внутренние предпосылки проведения реформы. Автор отмечает, что первым важным шагом в деле организации регулярной армии ВКЛ стала военная реформа 1717 г., закрепленная решениями «немого» сейма. Важным моментом в процессе оформления литовской армии стали решения конвокационного сейма 7 мая 1764 г., где было принято решение о создании Военной комиссии – Consilium bellicum. Именно эта комиссия в последующем должна была стать катализатором реформирования армии Великого Княжества. В статье отражаются основные направления военной реформы в Речи Посполитой 1775 г. Автор внимательно изучает изменения в системе организации управления армией, пути финансирования ее штаба, гвардейских и полевых подразделений. Четко показана структура штаба литовской армии и ее гвардейских частей. Внимательно изучена организация кавалерийских и пехотных подразделений и их структурных элементов. Реформа армии Великого Княжества Литовского предусматривала серьезные структурные изменения, в частности, она разделялась на две дивизии. Планировалось увеличение количества пехотных подразделений за счет сокращения некоторых кавалерийских частей, а также кардинальная реорганизация кавалерии. В результате проведения реформы литовская пехота стала насчитывать 7 полков и 2 янычарские хоругви. Вместо прежнего разделения конницы на гусаров, пятигорцев и казацко-татарские легкие хоругви вводилось разделение на тяжелую национальную кавалерию и легкую переднюю стражу. В статье отмечены основные сложности в вопросе формирования артиллерийских подразделений.

В итоге автор приходит к вполне обоснованному выводу, что, несмотря на половинчатость военной реформы 1775 г., она стала серьезной попыткой модернизации как польской армии, так и армии Великого Княжества Литовского.

***Stanislau Czaropka***

## MILITARY REFORM OF 1775 IN THE ARMY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

*Summary*

In presented article the condition of regular army of the Grand Duchy of Lithuania in the middle of 18$^{th}$ century is considered. The author gives the short review of a foreign and domestic historiography on a research theme. Foreign policy and internal preconditions of carrying out of reform are shown. The author notices that the military reform of 1717 fixed by decisions of a «mute» parlament became the first important step to business of the organisation of regular army of GDL. An important point in the course of registration of the Lithuanian army of a steel of the decision parlament on May, 7$^{th}$, 1764 where it was accepted the decision on creation of the Military commission – Consilium bellicum. This commission in the subsequent should become the catalyst of reforming of army of Grand Duchy. In article the basic directions of military reform in Polish-Lithuanian Commonwealth are reflected of 1775. The author attentively studies changes in system of the organisation of management of army, ways of financing of its staff. The structure of a staff of the Lithuanian army and its household troops is accurately shown. The organisation of cavalry and infantry divisions and their structural elements is attentively studied. Reform of army of Grand Duchy of Lithuania provided serious structural changes, in particular it was divided on two divisions. The increase in quantity of infantry divisions for the account of reducing of some sabres, and also cardinal reorganisation of a cavalry was planned. As a result of reform carrying out the Lithuanian infantry became 7 regiments and two yanichar bataliones. Instead of former division of a cavalry into hussars, piacihorcy and the Cossacks-Tatar easy squadrons, division into a heavy national cavalry and easy forward guards was entered. In article the basic complexities in a question of forming of artillery divisions are noted. As a result the author comes to quite substantiated conclusion that despite incompleteness of military reform of 1775, it became serious attempt of modernisation both the Polish army, and army of Grand Duchy of Lithuania.

*Дата паступлення ў рэдакцыю: 11.11.2013*